Пілецкі В.А. Вялікае княства Літоўскае ў 80-я гг XIV ст. – пачатак унутрыпалітычнага супрацьстаяння // Гістарычна-археалагічны зборнік. Вып. 27 – Мінск: Беларуская навука, 2012 – 354 с. С. 15 – 18.

***Віктар Пілецкі (Мінск, Мінскі інстытут кіравання)***

# ВЯЛІКАЕ КНЯСТВА ЛІТОЎСКАЕ Ў 80-я ГАДЫ XIV ст. – ПАЧАТАК УНУТРЫПАЛІТЫЧНАГА СУПРАЦЬСТАЯННЯ

Гісторыя Беларуска-літоўскай дзяржавы ВКЛ падчас яе ўтварэння не зафіксавала сур'ёзнага ўнутрыпалітычнага супрацьстаяння. Нездарма некаторыя гісторыкі сцвярджаюць выключна мірны характар балта-славянскага дзяржаўнага станаўлення, падштурхнуты знешняй пагрозай з боку Залатой Арды і Тэўтонскага ордэна [1].

Самыя пачатковыя сутыкненні падчас перыяду зараджэння дзяржавы былі характэрны наяўнасцю і барацьбой трох рэлігійна-палітычных сіл удзельнікаў працэсу ўтварэння ВКЛ, на што мы ўжо звярталі ўвагу [2, 36–41]. Яны выразіліся ў супрацьстаянні праваслаўна-палітычных суб'ектаў дзяржаваўтваральнай палітыкі, прадстаўленых Вечам г. Наваградка і Галіцка-Валынскім княствам, каталіцка-палітычнымі сіламі ў асобе Папства і Ордэнскай дзяржавы, падпарадкаванай Ватыкану, а таксама язычніцкімі жмудска-яцвяжскімі сіламі, якія таксама мелі свае ўласныя палітычныя інтарэсы.

Суперніцтва на пачатковым этапе ўтварэння дзяржавы не набыло шырокага размаху і адбывалася на рэгіянальным узроўні. У ім удзельнічалі Ордэнская дзяржава, Галіцка-Валынскае княства ў саюзе з татарамі і жмуцка-яцвяжскія князі. Канешне, нараджэнне феадальнай дзяржавы не магло быць зусім бяскроўным, яна адстойвала сваё права на існаванне выключна праз ваенныя канфлікты, але калі звярнуць увагу на маштабнасць ваенных дзеянняў падчас утварэння ВКЛ, то яны выглядаюць адносна нязначнымі.

Пэўнае ўнутрыпалітычнае супрацьстаянне было на стадыі аднаўлення ўлады над прастолам будучага ВКЛ – Войшалкам – пасля манастырскага перыяду яго дзейнасці. Ён, у саюзе са сваім дваюрадным братам полацкім князем Таўцівілам, ліквідавалі галіцка-валынскую прысутнасць у Наваградскай дзяржаве (шляхам забойства Рамана Данілавіча), а таксама ваенным шляхам далучылі балцка-летувіскія тэрыторыі Нальшчаны і Дзяволтву. Пра што летапісец сказаў: «... Войшалк стаў княжыць па ўсёй зямлі Літоўскай, і пачаў ён вынішчаць сваіх ворагаў, і перабіў іх безліч, а іншыя разбегліся хто куды...» [3, с. 52–53].

Наступныя князі, за выключэннем слаба асветленага гістарычнымі крыніцамі перыяду пераходу ўлады ад Трайдзеня да Віценя (1282–1295 гг.), дзе называюцца прозвішчы: Путувера [4, с. 1–43], Будзікіда [5, с. 113] Бурдзікіда [6, с. 356], Лютувера, Будзівіда і Даўмонта (?) – пра якіх неаднаразова выказваліся меркаванні ў гістарыяграфіі, таксама, або не пралілі многа крыві, або гэтыя падзеі на сённяшні дзень з-за недахопу гістарычных крыніц могуць быць успрыняты як адносна мірныя.

Выключна важным этапам гісторыі станаўлення дзяржавы і адной з ключавых падзей гісторыі Вялікага Княства Літоўскага Рускага і Жамойцкага другой паловы XIV ст. было супрацьстаянне паміж Ягайлам (1352(?)–1434) і Кейстутам (1297–1382), якое закончылася забойствам апошняга і змяненнем раскладу палітычных сіл, а таксама палітычнай раўнавагі, устаноўленай падчас княжання Альгерда-Кейстута.

Супрацьстаянне Ягайлы з Кейстутам у 80-х гг. XIV ст. фактычна распачало ягелонскі накірунак палітыкі ў гісторыі дзяржавы, які прывёў да збліжэння з Польшчай і паступовага перамяшчэння ВКЛ на другарадныя пазіцыі ва ўсходнееўрапейскім рэгіёне.

Перыяд, што папярэднічаў канфлікту, калі ва ўладзе знаходзіліся браты-манархі (Альгерд і Кейстут), быў унікальным па сваёй сутнасці ў гісторыі ўсходнееўрапейскага рэгіёна. На працягу больш чым трыццаці гадоў (1345–1377) Беларуска-літоўская дзяржава знаходзілася пад уладай двух фактычна раўнапраўных манархаў, паміж якімі гістарычныя крыніцы не зафіксавалі ніякіх супярэчнасцяў. Яны разам змагаліся з найбольш сур'ёзнымі апанентамі, курыруючы адначасова палітыку асобных частак адзінай дзяржавы (Кейстут абараняў яе з Захаду, а Альгерд з Усходу). Прычым гэтыя трыццаць два гады былі перыядам інтэнсіўнага росту тэрыторый (колькасць падуладных зямель узрасла прыблізна ўдвая) і паспяховага змагання з надзвычай магутнымі і агрэсіўнымі суседзямі, сярод якіх татары і крыжакі ўяўлялі з сябе сілы агульнаеўрапейскага маштабу магутнасці.

Вытокі канфлікту з Кейстутам былі звязаны з жаданнем Ягайлы застацца адзінаўладным кіраўніком ВКЛ. М. В. Доўнар-Запольскі пісаў: «... Пасля смерці Альгерда пачаўся кароткі перыяд суправіцельства Ягайлы і Кейстута. Але пляменнік не мог прымірыцца з аўтарытэтам уплывовага Кейстута. Пачалася барацьба, у якой састарэлы Кейстут быў пазбаўлены жыцця Ягайлам...» [7, с. 57].

Своеасаблівую адметнасць канфлікту надавала тое, што ён быў непасрэдна звязаны з асобай нейкага,

невядомага раней, Вайдылы. Летапіс паведамляе, што гэты чалавек меў простанароднае паходжанне, але змог, дзякуючы свайму прыбліжанаму да князя становішчу, «выбіцца ў людзі» і адыграць адну з ключавых (хоць і з трагічным фіналам) роляў у канфлікце. Быў у князя Альгерда – піша летапісец – «... нейкі халоп, парабак нявольны, звалі яго Вайдыла. Спачатку быў ён пекарам, потым прызначыў яго князь пасцель слаць і ваду піць падаваць, і вельмі палюбіўся ён Альгерду, і даў быў вялікі князь яму Ліду трымаць і вывеў яго ў людзі» [8, с. 99].

Пасля смерці Альгерда Вайдыла перайшоў па спадчыне да Ягайлы і ўмацаваў сваё становішча яшчэ болей. Прыблізна праз два гады пасля прыходу да ўлады Ягайла ажаніў Вайдылу на сваёй сястры Марыі, чым моцна пакрыўдзіў Кейстута, аддаўшы асобу княжацкай крыві «за халопа».

Але гэтым справа яшчэ канчаткова не абвастрылася. Кейстут прамаўчаў, памятаючы сваё паразуменне з братам і выконваючы ягоную волю, якую яны агаварылі яшчэ раней аб тым, што іх самыя любімыя сыны Ягайла і Вітаўт пасля іх смерці зоймуць вялікакняжацкі пасад. «А меж собою любили сынов своих – гаворыць летапіс – князь великии Олкгирд Якгаила, а князь великии Кестутеи Витофта, и говорили меж собою: «По нашем животе тут будут на великих княжествах... государствовати». Князь же великии Витовт в великои любви были с князем Якгаилом при отцех своих» [9, с. 224].

Тым не менш Ягайлу было цесна ва ўмовах супрацоўніцтва з аўтарытэтным Кейстутам і ён пачаў, з дапамогай Вайдылы, ствараць кааліцыю з адвечнымі праціўнікамі ВКЛ – крыжакамі. «І ўвабраўся той Вайдыла ў вялікую моц за князем Ягайлам, ды пачаў з немцамі соймы чыніць, раіцца і падпісвацца пад граматамі супраць вялікага князя Кейстута» [8, с. 99].

Але Кейстут хутка даведаўся пра гэта ад кіраўніка аднаго з тэўтонскіх замкаў «астродскага комтура Лебестына» (цяпер г. Астрода ў Быгдошчскім в-ве рэсп. Польшча). З ім у яго былі добрыя адносіны, бо той даводзіўся яму кумам. Хрысціў дачку Кейстута, якая была замужам за мазавецкім князем Янушам.

Атрымаўшы гэтую непрыемную навіну, стары Кейстут адразу ж паскардзіўся свайму сыну. Але Вітаўт, пачуўшы ад бацькі аб здрадзе Ягайлы, адразу не паверыў яму, бо яшчэ з дзяцінства, як неаднаразова адзначалася ў летапісах, у іх склаліся вельмі блізкія і нават сяброўскія адносіны.

Наступным недружалюбным актам Ягайлы, які канчаткова абвастрыў без таго няпростыя адносіны і прымусіў Кейстута дзейнічаць, была спроба Ягайлы прызначыць полацкім князем, замест другога сына Кейстута – Андрэя Гарбатага – свайго брата Івана Скіргайлу. Калі Скіргайла з граматай ад Ягайлы прыехаў у Полацк, то полацкае Веча не пагадзілася з гэтым прызначэннем і не дазволіла яму самавольна заняць пасаду. Тады Скіргайла, аб'яднаўшыся з войскамі лівонскіх крыжакоў, аблажыў горад і пачаў рыхтавацца да штурму.

Кейстут яшчэ раз вымушаны быў звярнуцца да сына. Але той зноў не паверыў у каварнасць свайго дваюраднага брата і паехаў па сваіх справах у Дарагічын. «И князь великий Кестутий опять начнеть сыну своему, великому князю Витовту, жаловатися и проплакивая на князя Ягайла: за Войдила сестру дал мою братанку; а из немец ми явлено, что немцы записалися на нас. А се пак третее с ким мы ся воюем, – с немцы: – они с ними Полоцка добывають. Уже то проявилося, – что они на нас полно стали с немцы. И князь велики Витовт отвечает отцю своему великому князю Кестутию: «еще того не доверяю гораздо». А рек то, князь великий Витовт, сам поехал к городу Дорогичину» [10, с. 56].

Пасля гэтага Кейстут вырашыў дзейнічаць самастойна. У лістападзе 1381 г., сабраўшы войскі, ён захапіў Вільню і ўзяў у палон Ягайлу, змясціўшы яго з вялікакняжацкага прастола. У выніку вобыску ў вялікакняжацкім палацы былі знойдзены граматы, якія Ягайла з Вайдылам атрымалі ад крыжакоў. Кейстут паслаў ганца за Вітаўтам, і той праз суткі прыехаў у Вільню. Ягайла вельмі ўзрадаваўся прыезду Вітаўта, бо спадзяваўся на яго дапамогу. Пасля размовы з братам яны абодва вымушаны былі прысягнуць Кейстуту як вялікаму князю, і тады Ягайлу былі вернуты яго даменныя ўладанні (Віцебская і Крэўская землі), а таксама маёмасць, каштоўнасці і інш. З гэтага часу, на працягу васьмі месяцаў (да ліпеня 1382 г.) вялікім князем літоўскім быў 85-гадовы Кейстут Гедымінавіч.

Ён аднавіў уладу над Полацкам (полацкае веча з радасцю прыняло рашэнне Кейстута), выгнаў з тэрыторыі ВКЛ крыжакоў і загадаў павесіць галоўнага віноўніка, як яму здавалася, разладу са сваім пляменнікам – лідскага намесніка Вайдылу.

Праз некаторы час Кейстут быў вымушаны пайсці ў паход на г. Ноўгарад-Северскі. Там патрэбна было ліквідаваць непавінавенне Карыбута Альгердавіча, які пад прыкрыццём непаразумення ў вярхоўным кіраўніцтве ВКЛ хацеў умацаваць сваё асабістае палітычнае становішча. На княскім прастоле ў Вільні быў пакінуты Вітаўт, а Ягайлу было загадана суправаджаць Кейстута. Але Ягайла не паслухаўся. Выкарыстаўшы адсутнасць Кейстута, ён сабраў войскі і захапіў Вільню. Па яго просьбе на дапамогу ў княства пачалі рухацца войскі яго саюзнікаў крыжакоў. Іх сустрэча з войскамі Ягайлы была запланавана ў Троках, якія Ягайла захапіў адразу ж пасля Вільні.

Атрымаўшы паведамленне Вітаўта аб захопе ўлады, Кейстут хутка прыйшоў назад. Яшчэ з дарогі ён паспрабаваў наладзіць кантакты са сваім зяцем мазавецкім князем Янушам. Жонка Кейстута, былая вайдэлотка Бірута, была накіравана ў Бярэсце з наказам устанавіць саюзніцкія адносіны. Але польскія феадалы, адчуўшы хістанне трону ВКЛ, пачалі захопліваць гарады Дарагічын, Камянец і акружылі Бярэсце, але ўзяць не змаглі.

Застаўшыся без саюзнікаў, Кейстут злучыў свае войскі з Вітаўтам непадалёк ад Коўна, і яны разам аблажылі Трокі. Праз некаторы час туды прыйшоў і Ягайла са сваімі і крыжацкімі войскамі. У выніку прыхільнікаў Ягайлы аказалася намнога больш.

Перад Кейстутам паўстала няпростая задача выбару новай тактыкі. Але тут Ягайла пайшоў на даволі хітры і каварны крок. Ён пачаў працягваць іграць ролю пакрыўджанага пляменніка, які чыстасардэчна просіць прабачэння. Да Вітаўта былі накіраваны паслы, з просьбай аб міры і прапановай сустрэцца і ўрэгуляваць узаемаадносіны. Вітаўт запатрабаваў, каб Ягайла, у пацверджанне сапраўднасці сваіх намераў, прыслаў свайго роднага брата Скіргайлу з клятвай ад свайго імя.

Праз некаторы час Скіргайла з'явіўся ў распалажэнні войск Кейстута, і Вітаўт пагадзіўся паехаць з ім да Ягайлы на перамовы. Пасля сустрэчы было вырашана запрасіць у распалажэнне войск Ягайлы і Кейстута. У вялікага князя не засталося выбару, нават родны сын паверыў праціўніку і падтрымаў яго. Выслухаўшы прысягу вернасці Ягайлы, перададзеную Скіргайлам і пацверджаную Вітаўтам, ён пагадзіўся і прыехаў у лагер Ягайлы. «Князь Скиргаило з Витовтом прыидеть ко князю великому Кестутю, и дасть прысягу Скиргаило князю великому Кестутю от князя великого Якгела и от себе. И князь великий Витовт с князем великим Кестутем, отцом своим, обадва поедуть у войско Якгеилово, на тые прысяги надеючыся» [11, с. 156].

Але клятвенная дамоўленасць з боку Ягайлы была парушана адразу. Як толькі ўсе аказаліся ў яго руках, Ягайла сказаў: «паехалі ў Вільню, там і дамовімся». Пасля ад'езду кіраўніцтва войскі Кейстута і Вітаўта раз'ехаліся па дамах і князі засталіся ў распараджэнні Ягайлы.

У Вільні Кейстут быў «закаваны ў ланцугі» і кінуты ў Крэўскі замак. Вітаўта некаторы час трымалі ў Вільні. Праз пяць дзён (15.08.1382) Кейстут, па загадзе Ягайлы, быў задушаны. Гэтае вераломства было ажыццёўлена слугамі-каморнікамі (іх звалі: Прокша, Мосцер, Кучук і Лісіца Жыбянцяй), тымі што былі прызначаны для абслугоўвання жыццёвых патрэб князя: падаваць ваду, слаць пасцель і ахоўваць. «И князь Якгеило тые прысяги переступил, и рек так: «Поедьмо до Вилни и там докончаем свое прысяги». И за тым войска ничого не почынали и оставили. И як до Вилни прыехавшы, там князь великий Якгеило князя великого Кестутья, дядю своего, оковавшы, до Крева послал и всадил у твержу, а князя великого Витовта оставили были у Вилни. И там у Креве князя великого Кестутя удавили пятое ночы коморники князя Якгеиловы...» [11, с. 156].

Паспяховыя дзеянні Ягайлы па ліквідацыі свайго асноўнага палітычнага апанента наўрад ці маглі б здзейсніцца, калі б яму ўдала не дапамагалі. Адным з самых важных памочнікаў будучага пачынальніка дынастыі ягелонаў была, відаць, яго маці – другая жонка Альгерда – Ульяна Цвярская (гг. ж.: каля 1332 – 1392). На той час гэта была сталая 53-гадовая жанчына, якая выдатна разумела, што палюбоўна вырашыць такі сур'ёзны канфлікт наўрад ці ўдасца. Былі закрануты сваяцкія сувязі з першым, пасля памерлага Альгерда, чалавекам у дзяржаве, які меў сваю ўласную сям'ю, прыход да ўлады якой мог адсунуць альгердавічаў ад трона назаўсёды.

Роля гэтай жанчыны, як сведчаць гістарычныя крыніцы, была выключна важная. Хутчэй за ўсё, гэта яна непасрэдна ўплывала на палітычныя падзеі той эпохі, і яе, відаць, можна лічыць аўтарам не толькі ўдалага станаўлення Ягайлы ў якасці вялікага князя ВКЛ, але і караля Польшчы. Найбольш яскравае сведчанне гэтаму – жорсткасць, з якой была знішчана жонка Кейстута і маці Вітаўта, Бірута. «Почырк жаночай рукі», прамой суперніцы ў барацьбе за ўплыў на мужчын і на палітычныя падзеі тут наўрад ці можна не заўважыць.

Былая вайдэлотка, прыгажуня Бірута, якую Кейстут у рамантычнай маладосці закахаўшыся выкраў з язычніцкага капішча, была верным сябрам і дарадцам мужа. Каханне гэта, відаць, захавалася да самай старасці. Кейстут браў яе з сабой усюды, нават у ваенныя паходы. Яна была яму патрэбна як жанчына, каханка і як памочнік у яго палітычнай дзейнасці. Яна была разам з мужам і ў тым паходзе, на Ноўгарад-Северскую зямлю, калі стары князь даведаўся, што яго законныя інтарэсы на прастол, пасля смерці Альгерда, узяўся зацята аспрэчваць малады і амбіцыйны пляменнік.

Менавіта Біруту паслаў Кейстут шукаць падмогі ў мазавецкага князя Януша на Берасцейшчыне, калі Ягайла з дапамогай крыжакоў аблажыў яго ўладанні на тэрыторыі Літвы. Яна заданне паспяхова выканала, хоць гэта і не дапамагло ў барацьбе за прастол. І вось менавіта Біруту, хоць яна і не займала дзяржаўна-палітычных пасад, было загадана ўтапіць пасля таго, як падасланыя ў вежу княжацкага палаца, у Крэўскім замку слугі-каморнікі, задушылі Кейстута.

Сам Ягайла, без парады «мамкі», наўрад ці адважыўся б на такое злачынства. Маральную адказнасць за яго магла ўзяць толькі «мацёрая свецкая львіца» той эпохі, якая выдатна разумела ролю жанчыны ў палітычных падзеях. Нягледзячы на тое, што сярэдневяковая жанчына не стаяла на першых прыступках і не значылася ў спісах палітычных дзеячаў, ад гэтага яна не станавілася менш жанчынай. Яна была самым блізкім дарадчыкам князя ў тым выпадку, калі ён быў моцным і ўплывовым. Калі ж ён быў яе сынам, а яна валявая і спрактыкаваная, то, безумоўна, палітыка вырашалася перш за ўсё ёю.

Магутнасць Ульяны Цвярской на гэтым этапе гісторыі Беларуска-літоўскай дзяржавы пацвярджаецца і тым, што яна ўплывала нават на найбольш важнае пытанне гісторыі сярэднявечча – якім было вялікакняжацкае пажалаванне зямель. Прычым гэтую функцыю маці вялікага князя заўважылі нават крыжакі.

У вядомым «сумарыуме Ягайлы і Вітаўта», які быў напісаны на тэрыторыі Тэўтонскага ордэна прыблізна ў 1412–1413 гг., сказана, што Вітаўт, пасля таго як Ягайла ўгаварыў яго на прымірэнне (з вяртаннем Вітаўту бацькавай спадчыны), вымушаны быў звярнуцца да Ульяны, каб яна дазволіла яму далучыць да сваіх зямельных уладанняў Луцкую зямлю [12, с. 99]. Княгіня дазволіла, як сказана ў дакуменце, але за гэта Вітаўт вымушаны быў паабяцаць ёй ізноў ахрысціцца ў праваслаўную веру.

Забойства Кейстута ў 1385 г. было паваротным у гісторыі ВКЛ. З гэтага часу пачалося поўнае перыпетый змаганне Вітаўта за аднаўленне бацькавай спадчыны, сваіх правоў і незалежнасці Княства ад іншаземных памагатых, якое саслужыла немалую службу ў разбурэнні стабільнага ўнутрыпалітычнага жыцця ў краіне, часоў Альгерда – Кейстута. Што ж тычыцца Вайдылы, то, як сведчаць летапісы, яго жыццё, нягледзячы на такі ўдалы пачатак – мела даволі трагічны фінал. Кейстут палічыў яго галоўным віноўнікам узнікнення сваіх непаразуменняў з любімым сынам брата. Стары князь у той час не мог ведаць таго, што менавіта неўтаймаваныя амбіцыі апошняга былі прычынай узніклых праблем, а ні які не «халоп» Вайдыла.

Вітаўт адстаяў свае права на кіраўніцтва бацькавымі ўладаннямі, а таксама змог адстаяць і правы ВКЛ на самастойнасць ад прэтэнзій польскіх феадалаў і прапольскай палітыкі Ягайлы. Апошні, заключыўшы Крэўскую унію з Польшчай, пачаў р'яна выконваць дадзеныя Кароне абяцанні. У 1387 г. ім выдадзены Прывілей, якім былі прадстаўлены моцныя эканамічныя прэферэнцыі тым феадалам, што пяройдуць у каталіцтва. Пачаўся працэс акаталічвання феадальнага насельніцтва ВКЛ, які быў адмоўна ўспрыняты праваслаўнай большасцю феадалаў Беларуска-літоўскай дзяржавы. Вітаўт узначаліў гэтыя сілы.

Пачалася барацьба, фіналам якой стала падпісанне Востраўскага пагаднення 1392 г., згодна з якім Вітаўт стаў паўнапраўным кіраўніком ВКЛ на пажыццёвы тэрмін. Спадчынныя ж правы на трон захаваў за сабой Ягайла. Інакш кажучы, хоць перамога была і на баку Вітаўта, але Ягайла на правах спадчыннага ўладальніка трону захаваў свой уплыў на княства. Можна сказаць, што ягелонскі перыяд у гісторыі ВКЛ працягваўся надалей, хоць і з пэўнай адасобленасцю ВКЛ ад Польшчы падчас княжання Вітаўта. А палітыка Ягайлы была скіравана на інтэграцыю дзвюх дзяржаў, і падчас гэтай інтэграцыі змагла выйграць Польшча. ВКЛ паступова саступіла лідарскія пазіцыі і аказалася на другарадным плане ва ўсходнееўрапейскай палітыцы.

Такім чынам, у выніку барацьбы Ягайлы з Кейстутам у ВКЛ у 80-я гады XIV ст. упершыню ў яго гісторыі разгарэўся ўнутрыпалітычны канфлікт з прыцягненнем замежных сіл ордэнскай крыжацкай дзяржавы. Супрацьстаянне мела сур'ёзныя палітычныя наступствы. Фактычна з яго пачаўся ягелонскі кірунак палітыкі ў гісторыі дзяржавы, што прывёў да збліжэння з Польшчай і паступовага перамяшчэння ВКЛ на другарадныя пазіцыі ва ўсходнееўрапейскім рэгіёне.

## ЛІТАРАТУРА


1. Краўцэвіч, А. К. Стварэнне Вялікага княства Літоўскага / А. К. Краўцэвіч. – Жэшаў, 2000. – 238 с.

2. Пілецкі, В. А. Да пытання аб характарыстыцы рэлігійна-палітычных сіл – суб'ектаў утварэння ВКЛ / В. А. Пілецкі // Актуальныя праблемы станаўлення і развіцця беларускай дзяржаўнасці (Да 90-годдзя ўтварэння БССР): матэрыялы Рэсп. навук.-тэарэт. канф., г. Мінск, 27 лют. 2009 г.: у 2 ч. – Ч. 1: Гісторыя беларускай дзяржаўнасці ад старажытнасці да 1918 г. / рэдкал. А. І. Андарала, М. М. Забаўскі, А. М. Люты і інш.; А. П. Жытко (навук. рэд.). – Мінск: БДПУ, 2009. – 244 с.

3. Летапісная аповесць пра Міндоўга і Войшалка / прадм. і пер. Вячаслава Чамярыцкага // Спадчына. – 1990. – № 3. – С. 50–53.

4. Puzyna, J. Kim był i jak się naprawdę nazywał Pukuwer, ojciec Gedymina / J. Puzyna // Ateneum Wileńskie. – Wilno, 1935, R. X. – S. 1–43.

5. Ермаловіч, М. І. Будзікід / М. І. Ермаловіч // Энцыкл. гісторыі Беларусі: у 6 т. – Т. 2: Беліцк – Гімн / Беларус. Энцыкл.; рэдкал.: Б. І. Сачанка (гал. рэд.) і інш. – Мінск: БелЭн, 1994. – 537 с.

6. Пазднякоў, В. Бурдзікід / В. Пазднякоў // Вялікае княства Літоўскае: Энцыкл.: у 2 т. – Т. 1: Абаленскі – Кадэнцыя / рэдкал.: Г. П. Пашкоў (гал. рэд.) і інш. – 2-е выд. – Мінск: БелЭн, 2007. – 688 с.

7. Доўнар-Запольскі, М. В. Гісторыя Беларусі / М. В. Доўнар-Запольскі / Беларус. Энцыкл., Нац. арх. Рэсп. Беларусь; пер. з рус. Т. М. Бутэвіч, Т. М. Кароткая, Е. П. Фешчанка. – Мінск, БелЭн, 1994. – 510 с.

8. Хроніка Быхаўца // Беларускія летапісы і хронікі: пер. са старажытнарус., старабеларус. і польск. / уклад. У. Арлова; прадм. В. Чамярыцкага. – Мінск: Беларус. Кнігазбор, 1997. – 432 с.

9. Евреиновская летопись (л. 476 об.) // Полн. собр. рус. летописей. Т. 35: Летописи белорусско-литовские / отв. ред тома Б. А. Рыбаков, сост. и ред. Н. Н. Улащик. – М.: Наука, 1980. – 305 с.

10. Летописец великих князей литовских // Гісторыя Беларусі ў дакументах і матэрыялах / скл.: В. К. Шчарбакоў, К. І. Кернажыцкі, Д. І. Даўгяла. – Менск: Выд-ва АН БССР, 1936. – 678 с.

11. Летопись Рачинского (л. 252) // Полн. собр. русских летописей. Т. 35: Летописи белорусско-литовские / отв. ред. тома Б. А. Рыбаков, сост. и ред. Н. Н. Улащик. – М.: Наука, 1980. – 305 с.

12. Ліцкевіч, А. «Сумарыум Ягайлы і Вітаўта» / А. Ліцкевіч // Беларус. Думка. – 2009. – № 11.



НАЦЫЯНАЛЬНАЯ АКАДЭМІЯ НАВУК БЕЛАРУСІ
Інстытут гісторыі

# *ГІСТАРЫЧНА-АРХЕАЛАГІЧНЫ ЗБОРНІК*

*Заснаваны ў 1927 годзе*

***Выпуск 27***

Мінск
«Беларуская навука»
2012

Нацыянальная акадэмія навук Беларусі
Дзяржаўная навуковая ўстанова
ІНСТЫТУТ ГІСТОРЫІ
Уваход. № ____
„__" ____ 200__ г.

Пілецкі В.А. Вялікае княства Літоўскае ў 80-я гг XIV ст. – пачатак унутрыпалітычнага супрацьстаяння // Гістарычна-археалагічны зборнік. Вып. 27 – Мінск: Беларуская навука, 2012 – 354 с. С. 15 – 18.